Асвячэнне новай капліцы адбылося 14 ліпеня 2001 года. Урачысты малебен правёў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт патрыяршы экзарх усея Беларусі ў прысутнасці і саслужэнні мітрафорнага протаіерэя Семіона (Мацюха) – настаяцеля



Свята–Марыінскай Царквы горада Вілейкі і благачыннага Вілейскай акругі, протаіерэя Фёдара (Кукса) – настаяцеля Свята–Ціханаўскага прыходу, протаіерэя Ігара (Шалухі) і многіх іншых светароў Вілейшчыны. Матэрыялы пра гэтыя падзеі змешчаны ў раённай газеце “Шлях

г. Вілейка
Чапаева,65
т. 5-79-66

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Вілейская гімназія № 2”**



# Капліца на месцы першай Вілейскай царквы

*гістарычнае даследаванне*
*вучняў 8 “В” класа*
*пад кіраўніцтвам*
*Іваненкі М.М.*

## 2023 год



Гэты фотаздымак зроблены ў 50-я гады 20 стагоддзя, незадоўга да разбурэння ўладамі праваслаўнай капліцы. Так выглядала старая капліца на плошчы Свабоды ў горадзе Вілейка, якая была пабудавана вернікамі на месцы самай першай Вілейскай царквы.

На падставе запісу ў царкоўнай кнізе 18 стагоддзя можна сцвярджаць, што царква ў Вілейцы была ўжо ў 15-16 стагоддзях. Больш познія гістарычныя крыніцы сведчаць пра існаванне ў Вілейцы драўлянай Спаса-Праабражэнскай царквы, будынак якой быў знішчаны пажарам у 1810 ці ў 1812 годзе.

капліцы ў скверыку на плошчы Свабоды, побач з помнікам воінам, якія аддалі сваё жыццё за свабоду роднай зямлі, і дзе некалі стаяў праваслаўны храм, належыць Свята–Марыінскаму прыходу.

Капліца была пабудавана на сродкі праваслаўных вернікаў Вілейшчыны з дапамогай асноўных прадпрыемстваў горада: завода "Буддэталі", мэблевай фабрыкі і іншых. Значны асабісты ўклад унесены Новікавым Валерыем Еўдакімавічам і Жуком Сяргеем Міхайлавічам.

Капліцу ўпрыгожваюць і надаюць ёй духоўнае, гістарычнае і культурнае значэнне тры іконы: Нараджэння Хрыстова, святой Прападобнай Еўфрасінні ігуменні Полацкай – вялікай асветніцы зямлі Беларускай, і ікона святога праведнага Іаанна Кармянскага, які праславіў нашу Бацькаўшчыну яўленнем сваіх Мошчаў зусім нядаўна.



Гэтыя іконы напісаны з захаваннем усіх кананічных патрабаванняў праваслаўнага іканапісу мастаком Вольгай Уладзімі-

Так выглядае капліца зараз. Прыгожы помнік архітэктуры, які з'яўляецца сімвалічным памятным знакам у гонар 2000–годдзя нараджэння Хрыстова і 400–годдзя ўтварэння горада Вілейкі. Яна ўвасабляе сабой свяшчэнную памяць удзячных нашчадкаў аб найвялікшай падзеі ў гісторыі чалавецтва – прыходзе ў свет Бога, які пажыў у чалавечым целе і быў укрыжаваны дзеля нашага збавення.

